Водгук
на аўтарэферат дысертацыі А.Ю. Комара «Дынаміка структуры фітацэнозаў і прыросту дрэвастояў хваёвых лясоў, трансфармаваных у выніку асушальнай меліярацыі і наступнай дэградацыі асушальных сістэм (на прыкладзе заказніка «Налібоцкі»)», якая прадстаўлена на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук

Асушальная меліярацыя замель і яе наступствы — даўгатэрміновая праблема эканомікі Беларусі, беларускай навукі, а экалогіі — найперш. Таму у актуальнасці тэмы дысертацыі А.Ю. Комара няма ніякага сумневу.

Асноўны вынік працы — прадромус асушаных хваеўнікаў заказніка «Налібоцкі», пабудаваны з выкарастаннем прынцыпаў і падыходаў эколага-фларыстычнай геабатанічнай (фітасацыелагічнай) школы. Аўтар выдзядяе 3 асацыяцыі (з субасцыяцыямі, варыянтамі і фацыямі), якія належаць да 3 саюзаў, 3 парадкаў і аднага класа. Таксама аўтар паказаў дынаміку хваёўнікаў пад уплывам асушальнай меліярацыі. Для працаўнікоў лясной гаспадаркі, на мой погляд, цікавымі павінны быць дадзеныя па радыяльным прыросце дрэў хвоі ў залоежнасці ад тэрміну асушэння.

Праца А.Ю. Комара робіць добрае ураженне. Пастаўлена і вырашана канкрэтная (хай сабе і лакальная) навуковая праблема. Да таго ж вынікі працы, безумоўна, маюць практычная значэнне. Асноўны змест добра адлюстраваны ў шэраге артыкулаў ды іншых публікацый. Маю надзею, што калі-небудзь артыкул аўтара з’явіцца і ў «Растительности России», а можа і ў міжнародных часопісах. Падставы для гэтага есць.

Да працы есць невялікія пытанні. Я, шчыра кажучы, не зразумеў, як суадносяцца класіфікацыі асушаных і неасушаных хваёўнікаў? Ці есць асацыяцыі (ці варыянты?), характэрныя выключна для асушаных лясоў? І наадварот?

Калісці (амаль што 50 год таму) я сам вандраваў па Налібоцкай пушчы і добра памятаю шматлікія меліярацыйныя каналы. Але мне здавалася, што ўжо у той час (1977–78 гг.) актыўнае будаванне новых меліярацыйных сістэм ужо не мела месца. Аўтар жа піша, што меліярацыя ў гэтых мясцінах адбывалася нават у 1980-х гадах.

З майго пункту гледжання, праца А.Ю. Комара «Дынаміка структуры фітацэнозаў і прыросту дрэвастояў хваёвых лясоў, трансфармаваных у выніку асушальнай меліярацыі і наступнай дэградацыі асушальных сістэм (на прыкладзе заказніка «Налібоцкі»)» адпавядае патрабаванням да кандыдацкіх дыссертацый по спецыяльнасці «Экалогія», а яе аўтар заслугоўвае атрымання адпаведнай навуковой ступені.

Даю дазвол на размяшчэнне водгуку пра дыссертацыю на афіцыйным сайце дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» у глабальнай кампутарнай сетцы Інтэрнэт.

Дырэктар Федэральной дзяржаўнай
бюджэтнай установы навукі
Батанічнага інстытуту імя В.Л. Камарова
Расійскай акадэміі навук
доктар біялагічных навук
заслужаны дзеяч навукі Санкт-Пецярбурга Д. В. Гельтман

3 лютага 2025 г.

Подпись руки Д.В. Гельтмана
ЗАВЕРЯЮ начальник ОК А.А. Ил.А. Бойкова
ОТДЕЛ КАДРОВ
Ботанического института
им. В.Л. Комарова
Российской академии наук

БИН РАН
Санкт-Петербург